**Доўнар Л.І.,** *суіскальнік*

# ДА ПЫТАННЯ АБ ПАЧАТКУ КНІГАДРУКАВАННЯ Ў МІНСКУ

Пытанне аб пачатку кнігадрукавання ў Мінску застаецца яшчэ недастаткова вывучаным, а таму патрабуе дэталёвага даследавання комплексу даведачна-бібліяграфічных матэрыялаў, комплексу крыніц па гісторыі кнігадрукавання і кнігазнаўству, навукова-гістарычных і навукова-літаратурных прац і асабліва першакрыніц адпаведнага перыяду (урадавага справаводства, афіцыйна-клерыкальных дакументаў, гісторыка-культурных матэрыялаў і інш.).

Даследаванне крыніц першых трох вызначаных напрамкаў дало магчымасць выявіць розныя пункты гледжання на пачатак кнігадрукавання ў Мінску. Так, «Drukarze dawnej Polski od XV do XVIII wieku, zesz.5. Wielkie ksiestwo Litewskie» (Wroclaw-Krako'w,1959) змяшчаюць звесткі аб існаванні ў Мінску яшчэ з 20-х гадоў XVII ст. друкарні праваслаўнага брацтва пры царкве св.Пятра і Паўла. Аднак невядомы ні мінскія выданні таго часу, ні іншыя архіўныя матэрыялы адносна гэтай друкарні, якія маглі б праясніць справу. Калі і існавала друкарня, то, магчыма, яе дзейнасць была абмежавана толькі ўнутранымі патрэбамі брацтва, або, як зазначыў Г.Я.Галенчанка, «брацтва падтрымлівала выданне некаторых твораў».

Не вызначана цвёрда месца выдання «Казанья» на смерць Аляксандра Фёдаравіча Шэптыцкага», надрукаванага мінскім ігуменам Паўлам Дамжывам Лютковічам у 1622 г.

Магчыма, далейшыя даследаванні змогуць высветліць або існаванне Мінскай брацкай друкарні, або дзейнасць перасоўнай друкарні Лютковіча.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

На канец XVIII ст. прыпадае дзейнасць Мінскай друкарні базыліянаў. Паводле «Bibliografii...» К.Эстрэйхера, а таксама спіса выданняў Мінскай друкарні базыліянаў, прыведзенага А.І.Мальдзісам (Книга, библиотечное дело и библиография в Белоруссии. Мн.,1974. С.130-150), можна меркаваць, што дзейнічала друкарня ў межах 1790-1793(4) гг. Выдавалася ў асноўным рэлігійная літаратура. Аднак застаецца пакуль не раскрытым шлях пераўтварэння яе ў казённую ( губернскую ) друкарню.

Пасля трэцяга падзелу Рэчы Паспалітай, калі ўсе беларускія землі ўвайшлі ў склад Расіі, а Мінск стаў сталіцай губерні, вызначылася правядзенне палітыкі расійскага ўплыву на апалячаную грамадскасць: ад жорсткасці ў канцы XVIII ст.(расправа з паўстаннем Т.Касцюшкі, закрыццё вольнага / прыватнага/ кнігадрукавання) да лаяльнасці і некаторага лібералізму ў адносінах да польскай шляхты ў пачатку XIX ст. (правядзенне шэрага рэформ друку і кнігавыдавецкай справы).

Так, пасля закрыцця Мінскай друкарні базыліянаў (час закрыцця невядомы) у 1797 г. пачала сваю дзейнасць Мінская губернская друкарня. Да 1807 г., калі з'яўляецца першая прыватная друкарня ў Мінску, губернская друкарня была адзінай у горадзе, а яе дзейнасць адзначалася параўнальна высокай прадуктыўнасцю. Менавіта тут убачылі свет першыя мінскія навуковыя, вучэбныя, прыкладныя і мастацкія кнігі грамадзянскага друку на рускай мове. Утрыманне за кошт сродкаў губернскага праўлення дазволіла губернскай друкарні праводзіць стабільную і даволі працяглую дзейнасць (да 1917 г.).

Такім чынам, першымі друкарнямі ў Мінску былі: царкоўная (магчыма не толькі базыліянаў) і казённая (губернская). Даследаваны матэрыял дазваляе адзначыць, што ўзнікненне кнігадрукавання ў Мінску было падпарадкавана ў першую чаргу сацыяльна-эканамічнаму і культурнаму статусу Мінска ў адпаведным рэгіёне ў XVII-XVIII стст., тым клерыкальна-афіцыйным патрэбам, якія фарміравалі ў пэўныя гістарычныя перыяды свой уплыў на грамадскасць. Аднак дзякуючы мясцоваму друку ў некаторай ступені выраціаліся патрэбы мінскай грамадскасці ў



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ